Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманні, ператрусы. Пераслед у Беларусі 21 і 22 сакавіка дапоўнена

22.03.2021 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, пераслед, затрыманні

Праваабарончы цэнтр "Вясна" 21 і 22 сакавіка сочыць за падзеямі ў краіне і працягвае фіксаваць факты палітычнага пераследу: прэвентыўныя затрыманні перад Днём Волі, ператрусы, новыя крымінальныя справы і іншыя формы ціску на грамадзян за іх актыўную грамадзянскую пазіцыю і незадаволенасць дзеяннямі ўладаў.

Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам праз тэлеграм-бот @viasna_bot ці на гарачую лінію:

- **+375 44 734 45 51**
- **+375 29 835 94 49**
- Тэлеграм **@ViasnaSOS, @SOSViasna**

Пераслед 22 сакавіка

Пераслед журналіста **Іллі Дабратвора** і яго сям'і працягваецца ўжо трэці дзень. Цяпер у ягоным недабудаваным доме ў Калодзішчах адбываецца ператрус. Пра гэта ў сябе на старонцы паведамляе сам журналіст.

Палітвязню **Ігару Лосіку** працягнулі тэрмін утрымання пад вартай на 2 месяцы, піша "Радыё Свабода". Ён у няволі 270 дзён. Ні пра следчыя дзеянні з яго ўдзелам, ні пра пачатак суду па-ранейшаму ніякіх звестак няма.

Як паведамляе "Віцебская Вясна", мясцовыя актывісты, якія раней прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 23.34), пачалі атрымліваць позвы з міліцыі з патрабаваннем з'явіцца ў пастарунак ранкам 25 сакавіка.

Каб уручыць павестку, супрацоўнікі МУС прыязджалі да некалькіх віцяблян на працу. Паводле дакументу, які атрымалі актывісты, ім «належыць 25 сакавіка 2021 году ў 10.00 з'явіцца» ў аддзяленні міліцыі «для правядзення апытання». Пра што будзе апытанне і з якой прычыны яно будзе праводзіцца, міліцыянты не кажуць.

У Мінску сёння за БЧБ-жалюзі на балконе затрымалі бацьку чатырох непаўналетніх дзяцей **Аляксея Васільевіча Мельянца**. У Леніскім РУУС на яго склалі пратакол, да суда змясцілі на Акрэсціна.

Вечарам у Мінску знік лідар АГП **Мікалай Казлоў.** Верагодна, яго затрымалі, палітыку пагражае да 3 гадоў. Як расказалі "Новаму Часу" ў прэсавай службе Аб'яднанай грамадзянскай партыі, старшыню партыі абвінавачваюць паводле часткі 1 арт. 407 (наўмыснае разгалошванне дадзеных дазнання, папярэдняга следства ці закрытага судовага пасяджэння).



Лідар АГП Мікалай Казлоў знаходзіцца на Акрэсціна. Пра гэта "Нашай Ніве" паведамілі яго аднапартыйцы.

> *«Выхожу. Если через 15 мин меня не будет — значит, задержан»,* — напісаў ён перад знікненнем а 19-й вечара.

Каля 30 затрыманых у Ваўкавыску

Як стала вядома ўвечары 22 сакавіка, у Ваўкавыску супрацоўнікі міліцыі затрымалі ўсіх удзельнікаў заняткаў "Мова нанова". Дакладная колькасць затрыманых і іх прозвішчы высвятляюцца. Вядома, што іх даставілі ў мясцовае РАУС. У чым прэтэнзіі міліцыянтаў – пакуль невядома, бо раней заняткі праходзілі без праблем і пытанняў з боку міліцыі.

Паводле інфармацыі TUT.BY, у міліцыю было дастаўлена **каля 30 чалавек**, аднаго непаўналетняга хлопца адпусцілі.

На занятках "Мова нанова" ў Ваўкавыску павінен быў выступаць лідар рок-гурта "Крама" **Ігар Варашкевіч**. Мясцовыя жыхары паведамілі, што яго таксама забралі, але пасля паступіла інфармацыя, што ён у бяспецы.

Са святаром **Аляксандрам Багданам** правялі гутарку і адпусцілі. Ён распавядае, што міліцыянты тлумачылі: атрымалі ананімны сігнал і таму прыехалі на месца правядзення курсаў.

Цяпер і астатніх дастаўленых у РУУС пачынаюць адпускаць па адным, папярэдне даюць падпісаць апавяшчэнне, дзе напісана аб адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў.

Як піша TUT.BY, затрыманых у Ваўкавыску наведвальнікаў курсаў адпусцілі. Папярэдне кожнаму давалі падпісаць апавяшчэнне, дзе напісана аб адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў.

Магілёўскага актывіста **Аляксея Барысава** выклікаюць на размову ў пракуратуру напярэдадні 25 сакавіка. Як распавёў сам актывіст, яго хацелі выклікаць на заўтра, але праз занятасць на працы Барысаў з'явіцца не зможа. Таму выклік перанеслі на 24 сакавіка на 12:20. Як растлумачылі актывісту па тэлефоне, "*нагода для гутаркі ў пракуратуры Магілёва – растлумачыць заканадаўства і не дапусціць яго парушэння з боку Аляксея*".

Пераслед 21 сакавіка

Мінск

У Мінску затрымалі 29-гадаовага **Юрыя Мікалаевіча Куўшынава**. Прычына: налепка з "Пагоняй" на заплечніку. Супрацоўнікі Ленінскага РУУС вырашылі, што ён пікетаваў такім чынам.

Увечары адбыліся затрыманні ў Чыжоўцы. Сярод затрыманых:

- **Леўкіна Людміла Мікалаеўна (08.01.1964);**
- **Кароль Алена Казіміраўна (14.07.1965);**
- **Макарэвіч Жанна;**

- **Меджыдава Аляксандра Алегаўна (1984)**

Іх даставілі ў Заводскае РУУС, над імі чакаюцца суды.

---

21 сакавіка была затрыманая жонка журналіста **Іллі Дабратвора** – маці пецярых дзяцей **Іна Дабратвор**. Увечары дома ў сям'і прайшоў ператрус, жанчыну адпусцілі.

Як паведамілі праваабаронцам «Вясны», каля 12:35 жонка журналіста Іна напісала блізкім: *«Прыйшлі двое, са мной жадае гаварыць намеснік начальніка Доўнар»*. Журналістку-фрылансерку **Іну Дабратвор** забралі, нягледзячы на тое, што дома заставаліся дзеці без дарослых. Каля 17 гадзін, калі блізкія Іны патэлілі ў Заводскі РУУС, каб даведацца, дзе жанчына і калі яе адпусцяць, ім адказалі: *«Хутка пойдзе дадому»*. Потым стала вядома, што дома адбываецца ператрус. Жонку затрымалі ў рамках праверкі па гэтым факце па арт. 341 КК Беларусі (апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці). Следчым камітэтам праводзіцца праверка. З Іны толькі ўзялі тлумачэнні, яна ні ў якім статусе не знаходзіцца. На жанчыну склалі пратакол за пікет па ч. 3 арт. 24.23 КаАП: нібыта яна пікетавала з дапамогай расклейваньня партрэтаў палітычных зняволеных.



> *"Забралі адзін маленькі сцяг, з акна адарвалі постэр Бабарыкі; Калеснікаву, Ціханоўскую і Пагоню не змаглі. Гэтак жа праводзяць праверку з нагоды партрэтаў палітвязняў у мяне ў пад'ездзе.*
>
> *На жонку склалі пратакол, па 24.23, частка 3", –* напісаў у Facebook **Ілля Дабратвор**.

За дзень да гэтага да журналіста **Іллі Дабратвора**, якога восенню затрымлівалі за асвятленне акцый у Мінску, прыязджалі сілавікі. Шукалі журналіста нібыта па адміністрацыйнай справе, але Іллі дома не было.

Як піша "Наша Ніва", днём 21 сакавіка на плошчы Незалежнасці ля Чырвонага касцёла быў затрыманы **Аляксандр Прушынскі,** больш вядомы як «граф Прушынскі». Мужчына раздаваў улёткі з нагоды хуткага Дня Волі. Раздаваць улёткі графу ўдалося 15—20 хвілін, пасля чаго яго затрымалі міліцыянеры. Мужчыну адвезлі ў Першамайскае РУУС, дзе пратрымалі шэсць гадзін.

> *«Я не першы раз затрыманы, я ведаю, як сябе паводзіць з міліцыянерамі. Я ім кажу: не важна, хто кіруе краінай, хай ваш Аляксандр Рыгоравіч, хай не ён, але дабрабыт людзей павінен расці. У Сінгапуры за 40 гадоў узровень жыцця вырас у чатыры разы, у Эстоніі за 26 гадоў — у тры разы. А мы стаім на месцы. У нас прадукты даражэйшыя, чым у Польшчы, а там заробкі вы самі ведаеце якія»,* — кажа спадар Аляксандр.

Граф Прушынскі кажа, што ў міліцыі неаднаразова гукаў «Жыве Беларусь». «Ні адзін, ні два і не тры разы. Я прапаноўваў міліцыянерам сфоткацца са мной як з кандыдатам у прэзідэнты, але яны баяліся».

На мужчыну быў складзены пратакол, сам Прушынскі не памятае, па якім менавіта артыкуле будзе суд.

Затрыманні адбыліся і ў "Новай Баравой". Як мінімум дваіх чалавек затрымалі ў нядзелю і адвялі ў мікрааўтобус. Невядомыя бегалі за хлопцам у бежавай куртцы. Другі затрыманы чалавек — імаверна, дзяўчына, паведамляе «Белсат».

Жыхары кажуць, што цэлы дзень так званыя «ціхары» ходзяць па замкнёных дварах Новай Баравой у кварталах «Форэст», «Квартал парк», «Нясумны сад». У іх пры сабе ёсць чыпы, якімі яны адчыняюць дзверы.

---

21 сакавіка МУС паведаміла, што 38-гадовага мінчука затрымалі за тое, што той забраўся на мачту з дзяржаўным сцягам на даху аднаго з дамоў у Новай Баравой, паведамляе УУС Мінскага аблвыканкама.

Мужчына займаецца будаўнічымі працамі на вышыні. Падчас учарашніх работ на даху будаўнік забраўся на флагшток, яго таварышы знялі гэта на тэлефон. У дачыненьні да яго склалі пратакол за дробнае хуліганства паводле арт. 19.1 КаАП.

Па інфармацыі "Радыё Свабода", 21 сакавіка затрыманы лідар сацыял-дэмакратаў **Ігар Барысаў,** яго змясцілі на Акрэсціна. Ягоная партыя падавала заяўку на святкаванне Дня Волі.



Ігар Барысаў. Фота Радыё Свабода

> *«Мы ехалі па вуліцы Геалагічнай, калі нас пачаў падразаць злева жоўты мікрааўтобус. Спыніліся. Адтуль выскачылі людзі ў цывільным, у чорных масках, выцягнулі Ігара з машыны, напалохалі чатырохгадовае дзіця»*, — паведаміла БелаПАН падрабязнасці затрымання жонка Ігара **Алена Барысава**.

Паводле яе, муж не супраціўляўся і нават падняў рукі. Барысава таксама паведаміла, што праз 20-30 хвілін ён патэлефанаваў і сказаў, што дастаўлены ў Партызанскі РУУС. Яна звярнулася ў УУС, каб выступаць у якасці прадстаўніка мужа, бо мае юрыдычную адукацыю.

> *«Інфармацыі ніхто не дае, і да мужа не дапусцілі. На падставе чаго яго затрымалі, невядома»*, — сказала Барысава.

Увечары жонцы паведамілі, што Ігар Барысаў затрыманы ў рамках адміністрацыйнага працэсу і цяпер у ізалятары на Акрэсціна.

Брэст

Брэстчане, якія раней прыцягваліся па арт. 24.23 (23.24) КаАП, напярэдадні Дня Волі масава атрымліваюць позвы ў пракуратуру. Верагодна, для правядзення прафілактычнай гутаркі і вынясення папярэджанняў аб недапушчальнасці парушэння Закона "Аб масавых мерапрыемствах".

Інфармацыя будзе дапаўняцца

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY